# *«БУДЗЕ НОВАЯ ПЕСНЯ…»*

**28 лютага 2023 года ў створанай Гродзенскім абласным аддзяленнем Саюза пісьменнікаў Беларусі Гродзенскай грамадскай літаратурнай школе займаліся імправізацыяй. Не проста імправізацыяй, а практычнымі даследаваннямі магчымасцяў нашых родных моў. Мерапрыемства было прысвечана Тыдню роднай мовы на Гродзеншчыне.**





У шэрагах вучняў літшколы гэтым разам можна было ўбачыць пачаткоўцаў і знакамітых літаратараў. Тэма пазачарговага занятку «Родная мова: імправізацыя» прыцягнула разнастайную аўдыторыю. Магчыма таму, што імправізацыя – гэта заўсёды творчая і псіхалагічная свабода, памножаная на мінімум адказнасці. Тым не менш, прадмет вывучэння – родныя мовы нашых калег і сяброў, абыходжанне з імі ў фармаце літаратурных эксперыментаў нікога не пакінулі без адказу. Так адбываецца кожны раз, калі вядучай сустрэчы выступае наш лідар, старшыня пісьменніцкай арганізацыі Гродзенскай вобласці Людміла Антонаўна Кебіч. Таксама адметнасцю такіх заняткаў з'яўляецца акцэнт на практыцы; тэарэтычным блокам было вырашана ахвяраваць. За даволі кароткі адрэзак часу, па арыгінальным прынцыпе ўдзельнікамі праекта былі напісаны цэласныя мастацкія творы-экспромты. Тыя, хто не справіўся з імправізацыяй, атрымалі заданні на дом.

Змястоўным і займальным атрымаўся аналітычны блок занятку. Абмеркавалі малавядомыя беларускія словы («шаляноўка», «тэчка», «крозы» і інш.). Закранулі і праанaлізавалі працэсы словаўтварэння. Людзі шчыра падзяліліся сваім стаўленнем не толькі да моў, але і да дыялектаў. Паэтэса Алена Шаламіцкая прыгадала так званую паляшуцкую мікрамову (яе лічаць адным з дыялектаў украінскай). Паразважалі пра дыялекты, на якіх размаўляюць у розных кутках Беларусі. Да літаратурных моў іх аднесці складана. Аднак пісаць мастацкія творы можна і з дапамогай дыялектаў як неад'емнай часткі моўнай палітры нашага народа. Гісторыі айчыннай літаратуры такія прыклады вядомыя. Мастацтва не толькі не павінна існаваць у адрыве ад народных традыцый, а наадварот, павінна на іх абапірацца – такая выснова сама сабой нарадзілася падчас творчай сустрэчы ў нашай літшколе ў апошні дзень зімы. Усімі была адзначана асаблівая, цёплая атмасфера мерапрыемства – вынік сумеснага творчага пошуку і плённай сустрэчы з родным словам.

**ПРЭС-СЛУЖБА СПБ-ГРОДНА**

**На здымках:** у офісе СПБ у Гродне праходзяць пазачарговыя заняткі Гродзенскай грамадскай літаратурнай школы, прысвечаныя Тыдню роднай мовы ў рэгіёне (тэма «Родная мова: імправізацыя»). 28 лютага 2023 года.



**Мэта ў нашых сяброў адна – літаратура, а родныя мовы розныя. У Кацярыны Калік (*у цэнтры*) – украінская.**



**Сярод удзельнікаў лютаўскага занятку ў літшколе СПБ-Гродна – лаўрэат Нацыянальнай літаратурнай прэміі Беларусі, лаўрэат III Абласнога конкурсу рукапісаў імя Цёткі, лаўрэат Прэміі Гродзенскага аблвыканкама імя А. І. Дубко, дзіцячая пісьменніца Ганна Скаржынская-Савіцкая**





Аматары літаратуры, паэтэсы Наталля Солтан і Галіна Садоўская







Аматар літаратуры, паэтэса Ірына Полудзень



Член СПБ, паэт Анатоль Апанасевіч



Аматар літаратуры, паэтэса, дзіцячая пісьменніца
Вольга Дзіканава нарадзілася ў горадзе Кемерава



З вершам-экспромтам пра родную Кубань выступіла член Гродзенскага гарадскога літаб'яднання «Надзея», паэтэса Таццяна Лугавая



Беларускі празаік Ірына Салата



Аматар літаратуры,
беларускі паэт Андрэй Бортнік



**Гродзенская паэтэса з Пінска Алена Шаламіцкая**



**Дзмітрый Радзівончык (СПБ)**



**Маладая аматар літаратуры, студэнтка ГрДУ імя Янкі Купалы Варвара Волкава**



**Усе разам**
***Фота* Анатоля Апанасевіча**